**УНІВЕРСАЛІІ ЭТЫКА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ X–XVIII СТСТ.**

*Болбас В.С.*
*(УО МГПУ им. И.П. Шамякина, Беларусь)*

МГПУ им. И.П.Шамякина

Сістэмны характар этыка-педагагічнай спадчыны Беларусі X–XVIII стст. дазваляе прадставіць адладжаныя жыццём і часам педагагічныя намаганні грамадства ў выглядзе мадэлі маральнага выхавання, якая сістэматворна аб’ядноўвае змястоўна-мэтавы і метадычна-арганізацыйны бакі маральна-выхаваўчага працэсу. Яна адлюстроўвае як агульнапедагагічныя падыходы да маральнага выхавання, так і ўплыў на распрацоўку яго праблем шматлікіх фактараў кожнага з вызначаных этапаў развіцця.

Сінкрэтызм пастулатаў хрысціянскай ідэалогіі і існаваўшай дагэтуль язычніцкай светапогляднай сістэмы абумовіў фарміраванне на ментальным узроўні рыс і якасцей асобы, якія на працягу развіцця беларускай нацыі з’яўляліся характарыстычна вызначальнымі. Духоўнасць, чалавекалюбства, абшчыннасць, аксіялагічнае адзінства чалавека і свету на ўсе часы сталі неад’емнай часткай маральнай характарыстыкі жыхара Беларусі. Антрапацэнтрызм і гуманізм Рэнесансу, абапіраючыся на хрысціянскае разуменне духоўнай самакаштоўнасці і непаўторнасці кожнага чалавека, зрабіў акцэнт у маральным ідэале на магчымасцях свабоднай і творчай асобы, узбагаціў змест маральнага

выхавання арыентацыяй на талерантнасць, гуманізм, індывідуалізм і патрыятызм. Духоўнасць набывае і свецкае вымярэнне. Такія падыходы да маральнага выхавання ў сукупнасці з этыка-педагагічнымі набыткамі папярэдніх пакаленняў умацоўвалі падмурак далейшага развіцця ідэй маральнага ўдасканалення асобы і грамадства, новы ўзровень якога быў дасягнуты дзякуючы распаўсюджаным у Беларусі адпаведным тэорыям Асветніцтва (вучэнне фізіякратаў, тэорыі "натуральнага права" і "грамадскага дагавору"). Перадумовы іх развіцця яскрава праяўляюцца ў другой палове XVII ст., а непасрэднае ўвасабленне ў жыццё ідэі Асветніцтва атрымліваюць у апошняй чвэрці XVIII ст. У выніку іх уздзеяння ў маральным ідэале на першым плане застаецца сацыяльная значнасць асобы, якая ў спалучэнні з уласнай годнасцю набывае дэмакратычную скіраванасць і грамадзянскую завостранасць. Сацыяльная справядлівасць, спалучэнне калектывісцкіх і індывідуалістычных асноў надаюць зместу маральнага выхавання адпаведныя асаблівасці.

Увогуле, прыярытэтнасць маральнага выхавання ў працэсе фарміравання асобы ўяўляе сабой адну з найважнейшых асаблівасцей развіцця этыка-педагагічнай думкі Беларусі. У адрозненне ад заходнееўрапейскіх тэндэнцый інтэлектуальна-асветніцкай, рацыянальна-прагматычнай скіраванасці асобы нашымі продкамі ва ўсе часы бясспрэчная перавага аддавалася развіццю духоўна-маральных якасцей чалавека.

Працэсуальны бок разглядаемай мадэлі маральнага выхавання змяшчае сфармуляваныя на аснове выяўленых заканамернасцей дакладныя патрабаванні да ажыццяўлення працэсу духоўнага развіцця асобы, якія з цягам часу аформіліся ў прынцыпы маральнага выхавання. Агульнай рысай дадзеных патрабаванняў з'яўлялася тое, што згодна ім выхаваўчыя намаганні павінны быць накіраваны не толькі на засваенне змястоўнага каштоўнасна-вартаснага напаўнення зместу маральнага выхавання, а на яго інверсійную праекцыю ва ўнутраны свет асобы, актыўна-дзейснае перажыванне, "пражыццё" яго сэнсаўтваральных асноў. Дадзенае патрабаванне ў той ці іншай ступені прысутнічае ва ўсіх групах прынцыпаў, прадстаўленых у вызначанай мадэлі маральнага выхавання, – базавых, гісторыка-анталагічных, метадалагічна-інструментальных.

Адной з дамінуючых тэндэнцыяй эвалюцыі прынцыпаў духоўнага ўдасканалення асобы з'яўлялася таксама іх скіраванасць на свабодны маральны выбар чалавека. З самага пачатку развіцця этыка-педагагічнай

МГПУ им. И.П.Шамякина

думкі паняцці “духоўнасць” і “свабода” мелі сэнсава-каштоўнасную сувязь.

Свабода маральнага выбару павінна разглядацца, па-першае, як дачыненне асобы да свету і адказнасць за яго; па-другое, як абавязковы падмурак “самабудаўніцтва” індывіда; па-трэцяе, як галоўны фактар адкрытасці і самаарганізацыі ўсёй выхаваўчай сістэмы.

Аналіз асноўных тэндэнцый развіцця этыка-педагагічнай думкі Беларусі дазваляе выдзеліць пэўныя кантэнты як у змястоўна-мэтавым, так і ў арганізацыйна-працэсуальным аспектах маральна-выхаваўчага працэсу, якія ўяўляюць сабой падмурак дадзенай мадэлі. На працягу гісторыі яны набылі надчасавы характар або статус універсалій маральна-выхаваўчай дзейнасці і выступаюць у якасці галоўных крытэрыяў ацэнкі, адбору і мэтанакіраванага фарміравання ў педагагічнай рэчаіснасці тых або іншых прынцыпаў, метадаў і сродкаў выхавання, тэхналогій ажыццяўлення педагагічнага працэсу з пункту гледжання іх перспектыўнасці.

Чалавекалюбства, свабода волі, сям’я, прыярытэтнасць маральнага выхавання, еднасць з прыродай, патрыятызм, грамадзянскасць, талерантнасць, гарманізацыя індывідуалістычных і калектывісцкіх асноў, секулярызаванасць пры актыўным выкарыстанні хрысціянскай этыкі, павышэнне суб’ектнасці выхаванцаў з’яўляюцца такімі ўніверсаліямі, яны і вызначаюць асноўныя тэндэнцыі развіцця этыка-педагагічнай думкі Беларусі X–XVIII стст. Таму і сама мадэль маральнага выхавання мае рэтраспектыўна-прагнастычны характар, бо характарызуе не толькі этыка-педагагічную думку мінулага, а і прадвызначае асаблівасці далейшага яе развіцця.

Светапоглядны і педагагічны сэнс вызначаных універсалій маральнага выхавання ўзмацняецца тым, што яны адпавядаюць хрысціянскім этычным нормам, менталітэту беларусаў, з’яўляюцца нашымі архітыпічнымі рысамі. Таму ў сучаснасці яны ўяўляюць сабой каштоўнасны падмурак фарміравання нацыянальнай ідэі, якая зацвярджаецца толькі ў выніку звяртання да духоўных вартасцей, выпрацаваных айчыннай культурай. Наогул, выхаванне і ідэалогія маюць адзіную сістэмаўтваральную аснову. У якасці звязуючых элементаў гэтых дзвюх форм культуры і выступаюць універсаліі маральна-выхаваўчага працэсу, якія прадстаўлены ў этыка-педагагічнай спадчыне нашага народа.

Сэнсаважыццёвыя арыентацыі выхавання як адлюстраванне вартасных каштоўнасцей грамадства заўсёды структураваны ў нацыянальную ідэю і ідэалогію дзяржавы, яны непасрэдна

МГПУ им. И.П.Шамякина

адлюстроўваюцца ў мэтах, змесце, спосабах і выніках жыццядзейнасці кожнага чалавека. Таму асэнсаванне гісторыі фарміравання этыка-педагагічнай спадчыны нашых продкаў дапамагае вызначыць неабходныя заснаванні, каардынаты для вырашэння сучасных праблем выхавання, адпаведнай падрыхтоўцы педагагічных кадраў. Далейшае развіццё айчыннай этыка-педагагічнай думкі павінна і будзе адбывацца на падмурку дасягненняў мінулага. Важна метадалагічна абгрунтаваць пераемнасць і месца ў развіцці сучаснай тэорыі і практыкі маральнага выхавання гістарычнага кантэксту этыка-педагагічнай думкі.

МГПУ им. И.П.Шамякина